**18.** Якія словы з дадзеных запісаны правільна?

*1) улей; 2) удзільна; 3) участак; 4) вужака.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**19.** Словы *чарнявы – бялявы, чысты – брудны* з’яўляюцца … .

*1) сінонімамі; 2) антонімамі; 3) амонімамі; 4) паронімамі.*

Выберыце правільны варыянт.

**А)** няма правільнага варыянта.
**Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**20.** Якія ягады на Беларусі маюць яшчэ назву *трускаўкі*?

**А)** чарніцы. **Б)** суніцы. **В)** клубніцы. **Г)** буякі. **Д)** маліны.

**21.** Які адпаведнік у беларускай мове мае рускае слова *пшено*?

**А)** авёс. **Б)** пшаніца. **В)** проса. **Г)** жыта. **Д)** аўсянка.

**22.** У народзе здаўна існуе прыкмета:

*Калі салавей спявае ўсю ноч, то чакай … дня.*

**А)** сонечнага. **Б)** халоднага. **В)** бязветранага.
**Г)** ветранага. **Д)** дажджлівага.

**23.** Пяты, самы малы палец на руцэ і назе называецца … .

**А)** мізінец. **Б)** мезенец. **В)** мезінец.
**Г)** мязінец. **Д)** мязенец.

**24.** Выберыце з дадзеных устойлівае спалучэнне, якому адпавядае значэнне *‘хутка, без асаблівай затраты часу’*.

*1) абы з рук; 2) на скорую руку; 3) майстар на ўсе рукі.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных прыкладаў.
**В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16
тэл. (017) 372 36 17, 372 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 13. Тыраж 28200 экз. г. Мінск. 2015 г.

Конкурс па беларускай мове

**«БУСЛІК-2015»**

*Чацвер, 19 лютага 2015 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай і электроннымі сродкамі забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (8 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 8 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 8 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 24 балы;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 120, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі. У заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу; пры парушэнні гэтых патрабаванняў удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваны;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/ праз 1-1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 3-4 класаў

**1.** Колькі склонаў у беларускай мове?

**А)** 3. **Б)** 4. **В)** 5. **Г)** 6. **Д)** 7.

**2.** Колькі слоў у сказе?

Упромняхсонечнагасвятлавадаўрацэіскрыласяўсіміколерамівясёлкі.

**А)** 5. **Б)** 7. **В)** 9. **Г)** 11. **Д)** 13.

**3.** Бабуля загадала ўнукам загадку:

*Ішла панна ўначы, згубіла ключы, месяц бачыў, а сонца падняло.*

Якое слова з’яўляецца адгадкай?

**А)** раса. **Б)** вясёлка. **В)** маланка. **Г)** адліга. **Д)** лужына.

**4.** Падлічыце колькасць слоў у сказе, якія маюць пяць гукаў.

*Спее грэчка пры бары і ловіць водар баравы.*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**5.** Выберыце з дадзеных назвы летніх месяцаў.

*1) кастрычнік; 2) жнівень; 3) красавік; 4) ліпень;*
*5) верасень; 6) чэрвень; 7) сакавік.*

**А)** чэрвень, жнівень, верасень. **Б)** сакавік, красавік, ліпень.
**В)** ліпень, кастрычнік, жнівень. **Г)** чэрвень, ліпень, жнівень.
**Д)** красавік, ліпень, жнівень.

**6.** Якія словы з дадзеных нельга падзяліць для пераносу?

*1) шчаўе; 2) адзін; 3) пачуў; 4) заўтра.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**7.** У міфалагічных уяўленнях нашых продкаў *вадзе* супрацьстаіць … .

*1) камень; 2) агонь; 3) гара; 4) неба.*

**А)** няма патрэбнага варыянта. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**8.** У якіх словах на месцы пропуску напішаце літару ***а***?

*1) д..рога; 2) с..бака; 3) к..рова; 4) н..га.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)**3, 4.

**9.** Колькі прыназоўнікаў ужыта ў вершаванай загадцы У. Карызны?

*З-пад мохавай сховы*
*Павысоўвалі хлопцы галовы.*
*Хто ні ідзе – іх вітае,*
*З сабой забірае.*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**10.** У народзе гавораць: *“Той не можа быць другам, хто абыдзе ў бядзе ...”*. Якога слова не хапае?

**А)** і не пашкадуе. **Б)** і не спыніцца. **В)** сцежкай.
**Г)** кругам. **Д)** агародамі.

**11.** Якія словы з дадзеных маюць тры цвёрдыя зычныя гукі?

*1) хвойка; 2) ямка; 3) воўна; 4) сонейка; 5) лісіца.*

**А)** усе прыклады, акрамя 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 4. **Г)** 3, 4. **Д)** 4, 5.

**12.** Нашы продкі лічылі, што рэпу і гарох можна садзіць толькі ў пэўных месцах. Нават існавала павер’е: *“Рэпу ды гарох не сей каля ...”*. Каля чаго нельга было сеяць рэпу і гарох?

**А)** каля хлява. **Б)** каля плота. **В)** каля хаты.
**Г)** каля варот. **Д)** каля дарог.

**13.** Выберыце з дадзеных словы, у якіх на месцы пропуску напішаце літару ***ь***:

*1) вішан..ка; 2) ліс..цікі; 3) лял..ка; 4) чац..вер; 5) лес..віца.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных варыянтаў.
**В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**14.** Падлічыце, колькі слоў ужыта ў вершаваных радках П. Макаля з літарай ***а***.

*Ад ранку да вечара*
*Сонца глядзела,*
*Каб жыта*
*Бурштынавым зернем*
*Паўнела.*

**А)** 0. **Б)** 11. **В)** 12. **Г)** 13. **Д)** 14.

**15.** Вучні запісвалі словы пад дыктоўку. Маша запісала *піаніна, подчырк, канвеяр*. Агата – *піаніна, почырк, канвеер*. Кірыл – *піяніна, почырк, канвеер*. Хто з вучняў запісаў усе словы без памылак?

**А)** усе вучні. **Б)** ніхто з вучняў. **В)** Маша. **Г)** Агата. **Д)** Кірыл.

**16.** Адгадайце народную загадку:

*Галубачка белая ў хату заляцела, а дзе і што сустракала, пра ўсё расказала.*

**А)** пісьмо. **Б)** тэлеграф. **В)** пасылка. **Г)** газета. **Д)** паштоўка.

**17.** Колькі назоўнікаў, якія абазначаюць уласныя назвы, ужыта ў вершаваных радках П. Панчанкі?

*Беларусь старажытная!*
*Полацк, і Віцебск, і Тураў,*
*І Заслаўе, і Мінск,*
*І Гародня, і Крычаў, і Пінск…*

**А)** 0. **Б)** 7. **В)** 8. **Г)** 9. **Д)** 10.